# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі Болбас Галіны Уладзіміраўны «Генезіс тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ў Беларусі X – пачатку XXI ст.» па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Дысертацыя Г.У.Болбас, прысвечаная аналізу прыродазгоднага выхавання ў Беларусі X – пачатку XXI ст., запаўняе лакуны гісторыка-педагагічных даследаванняў у айчыннай педагагічнай навуцы з мэтай асэнсавання глыбінных працэсаў фарміравання асобы і захавання ўнікальнай культурнай спадчыны.

Актуальнасць дысертацыі прадыктавана не толькі дэкларуемым пераходам да ўстойлівага развіцця, але і глыбіннымі зменамі ў псіхолага-педагагічнай рэальнасці: цыфравізацыя адукацыі, рост стрэсагенных нагрузак, адчужэнне дзіцяці ад прыроднага асяроддзя, распаўсюджванне антрапагенных рызык. У гэтых умовах прыродазгоднае выхаванне перастае быць абстрактнай ідэяй і ператвараецца ў надзённую практычную задачу фарміравання экалагічнай свядомасці, рэсурсазберагальных паводзін і каштоўнасных адносін да сябе, іншых і свету. Г.У. Болбас пераканаўча даказвае, што менавіта ў беларускай педагагічнай думцы, дзякуючы яе гісторыка-культурным асаблівасцям, акумуляваны магутны рэсурс для вырашэння гэтай задачы. Работа непасрэдна суадносіцца з Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага развіцця, што ўзмацняе яе запатрабаванасць.

Навуковая навізна праяўляецца ў тэарэтычнай канцэптуалізацыі феномену, якая разгортваецца праз вылучэнне трох узаемазвязаных структурных пластоў. Першы – канстытутыўна-рэгулятыўны – уяўляе сабой сістэму прынцыпаў-рэгулятываў, якія задаюць метадалагічныя арыенціры. Другі – каштоўнасна-мэтавы – фіксуе аксіялагічныя прыярытэты і мэты выхавання. Трэці – змястава-працэсуальны – раскрывае вопыт, які падлягае асваенню, і метады яго трансляцыі. Такое структураванне дазваляе пераадолець апісальнасць, характэрную для многіх гісторыка-педагагічных работ, і выйсці на ўзровень праектавання выхаваўчага працэсу. Першаснасць канстытутыўна-рэгулятыўнага кампанента абгрунтавана аўтарам праз спецыфіку прыродазгоднага выхавання, дзе прынцыпы вызначаюць логіку ўсіх астатніх элементаў.

Асаблівую цікавасць з пункту гледжання педагагічнай антрапалогіі ўяўляе распрацаваная аўтарам сістэма прынцыпаў. Да першай групы аднесены прынцыпы апеляцыі да розуму і свядомасці, нагляднасці, экалагічнасці; да другой – свабоды, руху да вышэйшага, стваральнай актыўнасці; да трэцяй – уліку ўзроставых, гендэрных, этнічных асаблівасцяў, а таксама ўкладу

сацыяльнай групы; да чацвёртай – уліку спецыфікі індывідуальнай прыроды выхаванца. Такі падыход арганічна ўпісваецца ў канцэпцыю цэласнага педагагічнага працэсу, дзе выхаванне разглядаецца як адзінства навучання, развіцця і сацыялізацыі, а прынцыпы выступаюць у ролі сістэмаўтваральных рэгулятываў.

Значным укладам у тэорыю выхавання з'яўляецца рэканструяваная аўтарам дынаміка каштоўнасна-мэтавага кампанента. На аснове гістарычнага матэрыялу Г.У. Болбас прасочвае змену дамінантных каштоўнасцяў: у X–XV стст. – духоўна-маральная скіраванасць, заснаваная на рэлігійных каштоўнасцях; у XVI-XVII стст. – сацыяльна-грамадзянская, якая сцвярджае каштоўнасць чалавека і зямнога свету; у XVIII – 30-я гг. XIX ст. – інтэлектуальна-псіхалагічная, якая прызнае каштоўнасць прыроды і чалавека як яе часткі; у 40-я гг. XIX ст. – 80-я гг. XX ст. – этнанацыянальная і грамадзянска-патрыятычная, якая акцэнтуе сацыяльную прыроду чалавека; з 90-х гг. XX ст. – маральна-экалагічная, заснаваная на каэвалюцыйным імператыве. Гэтая эвалюцыя паказвае, што прыродазгоднае выхаванне – гэта сістэма, якая гістрарычна развіваецца і пры гэтым захоўвае сваё каштоўнаснае ядро (гарманізацыя адносін чалавека са светам).

У кантэксце прафесійнай педагогікі заслугоўвае ўвагі аналіз метадаў выхавання. Г.У. Болбас дэманструе заканамерны пераход ад метадаў знешняй рэгламентацыі (пост, забароны, пакаранні, запалохванні, павучанні) да метадаў, якія стымулююць суб'ектную актыўнасць (рэфлексія, педагагічная падтрымка, стварэнне выхаваўчых сітуацый, праектны метад, кейс-метад). Гэтая выснова мае прамое дачыненне да сучасных адукацыйных стандартаў, якія патрабуюць ад настаўніка не трансляцыі гатовых ведаў, а арганізацыі сумеснай дзейнасці, якая спрыяе самаразвіццю і самавызначэнню навучэнцаў.

Распрацаваная аўтарам тэхналогія гісторыка-педагагічнага трансферу (з апорай на тэорыю культурнага трансферу і дыялагічную канцэпцыю М. М. Бахціна) і пабудаваная на яе аснове прагнастычная мадэль маюць непасрэднае дачыненне да прафесійнай падрыхтоўкі будучага настаўніка. Як вядома, эфектыўнасць педагагічнай дзейнасці шмат у чым вызначаецца сфарміраванасцю каштоўнасна-сэнсавай сферы асобы педагога, яго гатоўнасцю да творчай самарэалізацыі і здольнасцю выбудоўваць суб'ект-суб'ектныя адносіны з выхаванцамі. Прапанаваныя Г.У. Болбас спецкурс “Філасофія і гісторыя прыродазгоднага выхавання” і электронны вучэбна-метадычны комплекс з'яўляюцца канкрэтным інструментам фарміравання такой гатоўнасці. Укараненне вынікаў даследавання ў адукацыйны працэс (10 актаў аб укараненні) пацвярджае значнасць працы.

Апрабацыя і публікацыйная актыўнасць (104 публікацыі, уключаючы 3 манаграфіі і 25 артыкулаў у часопісах, якія рэцэнзуюцца) адпавядаюць высокім стандартам у адносінах доктарскай дысертацыі.

Такім чынам, дысертацыя Г.У. Болбас з'яўляецца завершанай, самастойнай навуковай працай, у якой абгрунтавана канцэпцыя генезісу тэарэтыка-метадалагічных асноў прыродазгоднага выхавання ў Беларусі. Даследаванне мае фундаментальнае значэнне для развіцця тэорыі выхавання, гісторыі педагогікі, педагагічнай антрапалогіі і этнапедагагікі, а яе вынікі могуць быць выкарыстаны (і ўжо паспяхова выкарыстоўваюцца) у сістэме бесперапыннай педагагічнай адукацыі.

Доктар педагагічных навук, прафесар,
галоўны навуковы супрацоўнік
лабараторыі спецыяльнай адукацыі
ДУА "Акадэмія адукацыі" М.Г.Яленскі

ОТДЕЛ КАДРОВ

Подпись Яленского М.Г.
заверяю.
Начальник отдела С.И. Шестопалова
«____» ________________ 20____ г.

Отзыв поступил в совет
28.05.2026